# МОЙ БРАТ

## Успаміны В.А. Шымавалос, в. Пархімаўцы

Не толькі ў Каленіках, а на ўсю акругу славіўся мой брат Ваня Карпач як адмысловы кравец. У дзевятнаццаць гадоў шыў усё - ніжняе і верхняе адзенне, кажухі. Меў многа вучняў. Быў надзвычай таварыскага, адкрытага характару. І ў нядзельныя ці святочныя дні на нашым падворку рабілася цесна ад ровараў. Хлопцы з'язджаліся і з блізкіх, і з далёкіх вёсак. Многія, як і Ваня, былі падпольшчыкамі ў час панавання памешчыц-кай Польшчы.

У 1940 г. брат быў прызваны ў войска. Служыў у конніцы, у горадзе Армавір Краснадарскага краю. Быў добрым салдатам. Помню, як любоўна захоўвалі ў хаце нумар газеты з фотаздымкам Вані, на якім ён стаяў каля свайго каня.

Вайна... Немцы разбілі часць недзе непадалёк ад Масквы. Па 4 - 5 чалавек прабіраліся байцы да фронту акружэння. Не здолелі, многія загінулі. У тамбоўскіх лясах Ваня блукаў ужо адзін. Заблудзіўся, пяць дзён поўз галодны. На шосты праваліўся ў нейкую яму пад яловым голлем. Там знайшоў компас і тры кавалачкі цукру. Гэта, мабыць, і выратавала. Адпачыўшы суткі, папоўз далей. У адкрытым полі натыкнуўся на немцаў і трапіў у палон. Доўга некуды гналі разам з іншымі. І вось Барысаў. Лагер для ваеннапалонных. Не людзі - цені былі там. Немцы ўжо слаба і ахоўвалі лагер. Разумелі: для ўцёкаў у гэтых людзей-зданей няма сіл. Ваня і яшчэ некалькі хлопцаў паспрабавалі ўцячы. Сіл Ваню хапіла толькі дабрацца да першай хаты. Гаспадыня добрая была, дала прытулак, а немцам сказала, што гэта яе сын.



*І. А.Карпач, 1940 г.*

Пакрысе паправіўся, пачаў шыць, зарабляў харчы або грошы.

Вярнуўся ён у родныя Каленікі вясной 1942 г. Але нядоўга радаваліся сыну бацькі. Яго і яшчэ некалькі мужчын з нашых вёсак (найбольш былых падпольшчыкаў) немцы забралі ў беластоцкую турму. Там зноў было пекла ад голаду. Перадачы, праўда, прымалі, хлеб і малако. І бацька кожную суботу запрагаў каня, маці пякла праснакі ці булкі, а ўсярэдзіне запякала кавалак мяса ці сала. Бутэлькі з малаком затыкалі пустым коркам - ён служыў паштовай скрынкай: усярэдзіну запіхвалі запіску, а назад Ваня такім жа чынам перадаваў сваю.

Колькі паездзіў бацька ў той Беласток! Толькі не ўратаваў сына. Яго перавезлі ў турму ці ў лагер, не помню дакладна, у Гданьск. Там і загінуў.

За Івана адпомсціў фашыстам мой малодшы брат, Аляксандр. Ён ваяваў, быў паранены, але вярнуўся дамоў жывым. І ўсё ж вайна забрала ў нашай сям'і не толькі Ваню. У 1946 г. не стала і маці - не змагла яна перанесці смерць любага сына, не вытрымала сэрца. Мне тады было шаснаццаць гадоў.



***Іван Карпач з таварышамі незадоўга да вайны.***

Глядзіць з фотакарткі на нас малады Іван. Колькі іх, такіх фотаздымкаў, у нашых беларускіх хатах...

Успаміны Веры Андрэеўны Шымавалос запісала
дачка Марыя Драпеза, в. Пархімаўцы, 1995 год.